УДК 81'282.2 (476.7)

# АДМЕТНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ВЕРХНЯГА НАД'ЯСЕЛЬДЗЯ

*А.А. Босак*[1], *В.М. Босак*[2]
[1]*Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт*
[2]*Палескі дзяржаўны універсітэт, bosak1@tut.by*

У складзе беларускай мовы асноўнаму масіву беларускай дыялектнай мовы супрацьпастаўляецца адносна невялікая заходнепалеская група гаворак. Арэал распаўсюджвання заходнепалескіх гаворак на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь – тэрыторыя Брэсцка-Пінскага Палесся.

На ізгалоснай мяжы паміж тыпічнымі заходнепалескімі і гаворкамі асноўнага масіву беларускай мовы нешырокі пояс утвараюць *паўночнабрэсцкія* гаворкі. На сумежжы паўночнабрэсцкіх і ўласна заходнепалескіх гаворак вылучаюцца гаворкі з умоўнай агульнай назвай сярэднебрэсцкіх. Гэта *сярэднепагарынская, беражноўская, лунінецкая, бобрыкская, паўночналагішынская, паўднёвацеляханская, стрыгінская, малецкая і верхнясельдская* гаворкі. Тыпічныя заходнепалескія, або загародскія, гаворкі складаюць чатыры досыць адрозныя структурныя разнавіднасці. Да іх адносяцца *паўночназагародская, сярэднезагародская, паўднёвазагародская* і *тараканская* гаворкі [5-6].

Тэрыторыя Верхняга Над'ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) уяўляе сабой адзін са своеасаблівых рэгіёнаў Беларусі. Тут праходзіць мяжа паміж заходнепалескай і гродзенска-баранавіцкай групамі гаворак. Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя цікавыя тым, што яны знаходзяцца на стыку Беларускага Панямоння і тыповага Заходняга Палесся ў зоне моўных міждыялектных кантактаў і дыялектных узаемаўплываў. Сумежныя гаворкі адрозніваюцца разнастайнасцю мясцовых асаблівасцей, даследаванне якіх мае важнае значэнне для гісторыі і развіцця беларускай мовы.

Фактычны матэрыял збіраўся на тэрыторыі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці (асноўная частка даследавання) і на сумежнай тэрыторыі Бярозаўскага, Івацэвіцкага, Камянецкага, Кобрынскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Свіслацкага і Слонімскага раёнаў Гродзенскай вобласці. Усяго абследаваны гаворкі жыхароў 231 населенага пункта, з іх у Пружанскім раёне – 214, Бярозаўскім – 6, Свіслацкім – 5, Ваўкавыскім – 1, Зэльвенскім – 1, Івацэвіцкім – 1, Камянецкім – 1, Кобрынскім – 1, Слонімскім раёне – 1 населены пункт.

Апытванне праводзілася па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала пытанні па фанетыцы, марфалогіі і лексіцы (Як у вас гавораць? Як у вас называюць?).

Поўная праграма даследавання ўключала 40 пытанняў па фанетыцы і 40 пытанняў па марфалогіі, а таксама 102 пытанні па лексіцы. Па поўнай праграме абследавана 118 населеных пунктаў. Па кароткай праграме (15 пытанняў па фанетыцы і марфалогіі) абследавана 113 населеных пунктаў Верхняга Над'ясельдзя.

Па выніках праведзенага даследавання складзена 204 карты, у тым ліку фанетычныя – 30, марфалагічныя – 40, лексічныя – 90, ізаглосныя – 35, гістарычныя – 5, агульныя – 4. Фанетычныя і марфалагічныя карты апублікаваны ў "Атласе гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Фанетыка і марфалогія" (Мн., 2005), лексічныя і гістарычныя – у "Атласе гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Лексіка" (Мн., 2006), фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя, ізаглосныя і гістарычныя – у дысертацыйнай рабоце "Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхняга Над'ясельдзя" (Мн., 2006), асноўныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя карты апублікаваны ў манаграфіі "Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя" (Мн., 2007) [1-4].

Верхняе Над'ясельдзе з'яўляецца ўскраінай пашырэння інавацыйных з'яў, якія пашыраліся ў гэты рэгіён з двух цэнтраў: паўночнага, ці гродзенска-баранавіцкага і паўднёвага, ці брэсцка-пінскага. Існуюць яшчэ

інавацыі ўласна палескія, якія супрацьпастаўляюцца як гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) поўначы, так і брэсцка-пінскаму (уласна загародскаму) поўдню.

Па выніках праведзенага даследавання на тэрыторыі Верхняга Над'ясельдзя выдзелены наступныя групы гаворак: *гродзенска-баранавіцкія* (уключаюць лыскаўскую і варанілавіцкую падгрупы) – на поўначы, *паўночнабрэсцкія акаючыя* (уключаюць роўбіцкую і вялікасельскую падгрупы) – на захадзе, *паўночнабрэсцкія окаючыя* (уключаюць шанёўскую і шарашоўска-гараднянскую падгрупы) – у цэнтры, *верхняясельдскія* (уключаюць рудніцкую, смаляніцкую і ліноўскую падгрупы) – у цэнтры, на ўсходзе і паўднёвым усходзе, *малецкія* – на паўднёвым усходзе, *паўночназагародскія* – на паўднёвым захадзе, *сярэднезагародскія* – на поўдні даследуемага рэгіёна.

Нарастанне адрозненняў паміж гродзенска-баранавіцкімі, паўночнабрэсцкімі, сярэднебрэсцкімі і загародскімі гаворкамі мае "ступеньчаты" характар пераходнасці.

Літаратура

1. Босак А.А. Дыферэнцыяцыя і арэальныя сувязі гаворак Верхяга Над'ясельдзя. – Дыс. … канд. філ. навук: 10.02.01. – Мн.: Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, 2006. – 257 с.

2. Босак А.А., Босак В.М. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Фанетыка і марфалогія. – Мн.: ІВЦ Мінфіна, 2005. – 94 с.

3. Босак А.А., Босак В.М. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Лексіка. – Мн., 2006. – 124 с.

4. Босак А.А., Босак В.М. Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя. – Мн., 2007. – 134 с.

5. Клімчук Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 127 с.

6. Крывіцкі А.А. Дыялекталогія беларускай мовы. – Мн.: Вышэйшая школа, 2003. – 294 с.

Полесгу